




Зьезду камандзіраў пролетарскай думкі — наш комсамольскі салют



ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 157 (1426) ПЯТНІЦА, 10 ліпеня 1931 г.

„Рабселькоры павінны паказваць прыклад адстаючым і садзейнічаць шырокаму разгортваньню абменам вытворчым вопытам па ўсім фронце соцыялістычнага будаўніцтва“

УДАРНАЙ ПРАЦАЙ ЛЯ ТОРПМАШЫН, БАРАЦЬБОЙ НА ШПАЛЬТАХ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ

АЖЫЦЬЦЯВІМ ЛЕНІНСКІ ПЛЯН ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ

Зьезд ударнікаў бальшавіцкага друку

Усесаюзная нарада рабселькораўскага руху веснаю гэтага году, вызначаючы задачы рабселькораў у рэконструкцыйны перыод, рашуча падкрэсьліла тое новае, што характэрна для дадзенага перыоду, а менавіта: рабселькор зараз ня можа абмежавацца толькі тым, што бярэ пад абстрэл свайго пяра бюрократаў, опортуністых, шкоднікаў, што бярэ пад абстрэл ход выкананьня тых ці іншых рашэньняў партыі, ўлады. Ён павінен сваёй творчай, гэроічнай работай, як перадавік у радох барацьбітоў быць організатарам барацьбы за выкананьне гэтых рашэньняў.

У адпаведнасьці з гэтым, пад кутом карэннай перабудовы работы з рабселькорамі праводзілася падрыхтоўка да ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду.

Такія масавыя мерапрыемствы, як: месячнік друку, справаздачна-перавыбарчая кампанія редколегій фабрычна-заводзкіх редколегій шматтыражак і насьценных газэт, агляд і праверка нізавога друку, работа па рэалізацыі 15 прапаноў менскіх ударнікаў газэты „Праўда“, „Зьвязда“, „Рабочий“, „Чырвоная Зьмена“, работа па організацыі ў кожным саўгасе, колгасе, МТС—насьценгазэты і інш. былі праведзены да ўсебеларускага зьезду камандзіраў пролетарскай грамадзкай думкі. І толькі дзякуючы гэтай праведзенай партыяй рабоце нізавыя мерапрыемствы, праводзімыя зараз на заводах, фабрыках, у саўгасах і колгасах не прайшлі міма ўдарнікаў-рабселькораў.

Сваёй самаадданай работай, рабселькоры на справе, штурмуючы пяцігодку ў 4 гады, ліквідуючы прарывы паказалі і паказваюць як трэба змагацца, як выконваць рашэньні партыі і ўраду. Грамадзкім бук сірам, рэйдам, рабселькоры навучаюць адстаючых, дапамагаюць ім у рабоце. Ударная брыгада рабселькораў зьяўляецца асноўным зьвяном рабселькораўскага руху.

Гістарычнае значэньне ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду яшчэ і ў тым, што ўпяршыню зьезд павінен будзе выразна конкрэтызаваць задачы, якія стаяць перад рабкорамі, селькорамі, прыстасоўваючыся да розных вучасткаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

На зьезьдзе будуць працаваць сэкцыі паасобных галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі: па торпаэнэргетыцы, мэталёвай прамысловасьці, чыгуначнаводнаму транспарту, тэкстыльна-швэйнай прамысловасьці, па перабудове коопэрацыі, дрэваапрацоўчай прамысловасьці, па жывёла-сьвінагадоўлі, МТС, ільнаводных тэхнічных культур, гарбарна-абутковай прамысловасьці.

Кожны рабселькор—удзельнік зьезду, актыўны ўдзельнік адной з гэтых сэкцый.

Матар'ялы—тэзісы сэкцый перад зьездам шырока абгаварваліся на шырокіх сходах, нарадах ударнікаў, рабселькораў. Але гэта яшчэ ня ўсё. Гэтага недастаткова. Зьезд рабселькораў працуе ў той час, калі перад партыяй, краінай, як ахарактарызаваў у сваёй прамове, на нарадзе гаспадарнікаў, правадыр партыі і рабочае клясы т. Сталін—паўсталі новыя задачы, якія патрабуюць работы па новаму.

Зьезд павінен будзе ня толькі ўлічыць усе дадаткі, зробленыя ўдарнікамі-рабселькорамі да матар'ялаў-тэзісаў у часе прапрацоўкі іх, а і павінен прасякнуць зьмест сваіх рашэньняў практычнымі пытаньнямі, накіраванымі на рэалізацыю гістарычнай прамовы тав. Сталіна. Праз зьезд мобілізаваць усю рабселькораўскую армію на хутчэйшае і практычнае ажыцьцяўленьне вызначаных тав. Сталіным чарговых задач.

Рабселькораўскі зьезд—зьезд сумленных актыўных барацьбітоў за генеральную лінію—партыі, павінен прайсьці пад знакам мобілізацыі сіл і энэргіі ўсіх рабселькораў на пасьпяховае выкананьне 3-га рашаючага году пяцігодкі, на пасьпяховае праводзеньне ўборачнай кампаніі. Рашэньні зьездаў павінны мобілізаваць рабкораў таксама на далейшае разгортваньне пролетарскай крытыкі і самакрытыкі, на бязьлітасную барацьбу супроць заціскачоў, за дзейнасьць самакрытыкі.

Торп пойдзе ў правады

Генэральны плян электрыфікацыі — гэта плян вялікай кладкі муроў соцыялізму.

Калі паглядзець на карту, дык можна ўбачыць, што ў Менску будзе пабудавана магутная цёпла-электрацэнтраль, якая дасьць 24 тысячы кілёват энэргіі.

24 тысячы кілёват электраэнэргіі ўвальлюцца ў прамысловасьць Барысава ад уноў пабудаванай па наметкам генэральнага пляну электростанцыі. Магутнейшая станцыя вырасьце ў Гомелі, страву для е дадуць Кабылянскія тарпяныя масывы.

У Магілеве будзе пабудавана элетрастанцыя, якая забясьпечыць сваёй энэргіяй вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў

А на базе Абольскага балота будзе пабудавана Паўночна-Беларуская „Дрэс“.

Акрамя гэтых станцый вырастуць у Магілеве ТЭЦ, у Рагачове, у Чашніках, у Грэску і ў іншых раёнах БССР— электростанцыі.

Такавы чарнавыя намёткі генэральнага пляну электрыфікацыі.

Страву ўноў будуемым электростанцыям павінны даць нашы беларускія багацьці — тарпяныя балоты.

Задача вялікая, яе можна ажыцьцявіць шляхам сапраўднага ператварэньня Беларусі ў тарпяны Донбас, шляхам скарыстаньня кожнага балота, шляхам мэханізацыі торпаздабычы.

Мала будаваць новыя станцыі, трэба ўмець скарыстаць маючыяся. Белдрэс—гэта вялікае дасягненьне Кастрычніка на Беларусі,—поўнасьцю не загружаны.

Віцебскі, Аршаўскі, Магілеўскі, Шклоўскі і іншыя раёны марудзяць з прыняцьцем Белдрэсаўскага току.

Рабселькоры павінны стаць у першыя шэрагі барацьбітоў за поўную эксплёатацыю існуючых электрастанцый, за забесьпячэньне стравай тых прадпрыемстваў, якія ўвальлюцца ў прамысловасьць БССР, згодна чарнавым намёткам генэральнага пляну.

Зьезд рабселькораў павінен будзе намеціць конкрэтныя шляхі для ажыцьцяўленьня гэтых важнейшых задач.

Рабкорыя, прымай нарад

(Прапановы рабочых торпзаводу „Шлях Соцыялізму“)

У барацьбе за ператварэньне Беларусі ў тарпяны Донбас, за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляnaў торпаздабычы рацыяналізацыя, вынаходства і максымальная мэханізацыя—зьяўляецца адным з рашаючых вучасткаў.

Мы маем значныя посьпехі па рацыяналізацыі і вынаходзтву на ўсіх галінах соцыялістычнай прамысловасьці, але ў галіне торпапрамысловасьці зроблена значна менш, чым гэта патрэбна.

Гіганцкія масывы беларускага тарпянога Донбасу павінны атрымаць удасканаленую максымальна-прыстасаваную машыну.

У працы беларускіх торпазаводаў вызначылася значная колькасьць процэсаў, якія з-за тэхнічных недахопаў адсутнасьці тых ці іншых машын, затрымліваюць працу, адмоўна адбіваюцца на выкананьне вытворчых заданьняў.

Мы прапануем:

На распрацоўцы малага гідра-торпу,—патрэбна павялічыць сілу прагалкваньня тарпяной масы з труб у перадатачныя мэханізмы.

Улічваючы, што гэты спосаб здабычы займае досыць вялікае месца ва ўсёй сыстэме торпараспрацовак—гэтая задача зьяўляецца адной з галоўнейшых для забясьпечаньня выкананьня прамфінпляну.

Экскавацыя тарпяной масы з кар'еру ў элеватар ліквідуе цяжкую працу кар'ершчыкаў і аслабаніць для больш рацыянальнага скарыстаньня амаль палову рабочых.

Зараз ужо ёсьць вынаходства на экскавацыі масы, якое прыстасавана выключна для бескарчавога балота, але, улічваючы тое што 50 проц. распрацоўваемых на Беларусі балот пністыя—гэтая задача патрабуе яшчэ свайго вырашэньня.

Ураўненьне тарпянога поля, сыстэматычны рамонт яго, зьяўляецца адным з найбольш трудаёмкіх процэсаў. Ёсьць замежны мэханізм для выкананьня гэтага процэсу, але ён ня прыстасаваны да ўмоў беларускіх торпараспрацовак. Торпапрамысловасьць павінна атрымаць савецкую машыну-плінтоўку.

Патрэбна мэханізаваць аўтаварачны нож для рэзкі торпу пры выхадзе з мундштука машыны, у гэтым напрамку дагэтуль амаль нічога ня зроблена.

У барацьбе за ўнядрэньне фрэзэрнай торпаздабычы значнае месца займае мэханізацыя процэсу варочаньня торпу. Маючыяся варашыльныя граблі вельмі грамодзкія і маюць шэраг вялікіх недахопаў.

Пытаньне асьвятленьня торпабалот асабліва ў час працы начной зьмены набывае асабліва важнае значэньне. Маючыяся ліхтары розных сыстэм не забясьпечваюць добраякаснай працы начной зьмены.

Пытаньне асьвятленьня, выходзячы з умоў працы торпазаводаў, скарыстоўваючы машыны для асьвятленьня без памяншэньня вытворчай магутнасьці мэханізмаў патрабуюць свайго хутчэйшага вырашэньня.

Вось некаторыя конкрэтныя задачы, якія высоўвае торпапрамысловасьць перад усімі рабселькорамі торпараспрацовак, прадпрыемстваў, спажываючых торп, навукова-дасьледчых устаноў і спэцыялістых.

Рабселькоры торпазаводаў, прадпрыемстваў, спажываючых торп, фабрыкі і заводы, вытвараючыя абсталяваньне для торпапрамысловасьці, навукова-дасьледчых устаноў— будзьце ініцыятарамі і організатарамі гэтай важнейшай працы.

Песьня рабкора-ударніка

Язэп Васілеўскі

Мы ў працы штодзённай
Імкненьнем гарым,
Краіну мацуем бэтонам.
Мы цяжкасьці працы
І кожны прарыў
Штурмуем ударнай колёнай.

Мы сёньня ў паходах
За сталь, за варштат,
Напружаны нэрвы і рукі.
Ударнік заводаў,
Ударнік брыгад—
Ударнік рабочага друку.

На вахце будоўлі
Стаіць вартавы,
Дзе ў неба ўзьнімаюцца вежы,
У надзейных руках
Загартованы штык
Вартуе савецкія межы.

Мы сёньня ў паходах і г. д.

За чорным кардонам
аполчышчы сіл,
У фокстротах спраўляюць
хаўтуры.
Хаўтурныя маршы
Уплятаюць вятры
У вянок эўропэйскай „культуры“.

Мы сёньня ў паходах і г. д.

Хай ворагі брэшуць
пра дэмпінгі цэн,
Пра вываз савецкага лесу,—
Мы плянавай працай
Разбурым ушчэнт
Хлусьню буржуазнае прэсы.

Мы сёньня ў паходах і г. д.

У адказ на варожыя
Вынікі здрад
Мы тэмпы будоўлі паскорым,
Каб кожны ўдарнік
Рабочых брыгад
Стаў сябрам брыгад рабселькораў.

Мы сёньня ў паходах і г. д.

Магутнаю сілай
У мільён кілёват
Дрыжыць дарагая плянэта.
Напорнаю працай,
Ударнік брыгад,
Прыблізім жаданыя мэты.

Мы сёньня ў паходах
За сталь, за варштат,
Напружаны нэрвы і рукі...
Ударнік заводаў,
Ударнік брыгад—
Ударнік савецкага друку.

Да ўсебеларускага зьезду рабселькораў

Рэйд „чырвоназьменаўскіх“ ударных брыгад

РЫХТУЙЦЕ БАЛЬШАВІЦКУЮ СУСТРЭЧУ НАВУЧАЛЬНАМУ!

„Камандзіры пролетарскай грамадзкай думкі“, у двухдэкаднік трывогі мобілізуем пролетарскую грамадзкасьць на барацьбу за пасьпяховы пачатак навучальнага году

Гураганны агонь па ўлюбёнцах опортуністычнага самацёку!

Фронт нацыянальна-культурнага будаўніцтва прарваны. Выкананьне раду вялізарных задач культурнага будаўніцтва пад пагрозай зрыву. Гэта прымусіла ЦК ЛКСМБ, Наркомасьветы і ЦП саюзу Працасьветы абвясьціць усебеларускі двухдэкаднік трывогі на фронце культурнага будаўніцтва.

Двухдэкаднік трывогі пачынаецца сёньня. Аднэй з задач, якая стаіць перад двухдэкаднікам трывогі, зьяўляецца мобілізацыя ўсёй пролетарскай грамадзкасьці на штурм за пасьпяховы і сваячасовы пачатак навучальнага году.

Пачатак новага навучальнага году-надзвычайны момант у агульнай барацьбе за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэволюцыі. Аднак, матар'ялы якія мы зьмяшчалі раней, а таксама факты, аб якіх ідзе сёньня мова, з ўсёй красамоўнасьцю сьведчаць аб тым, што падрыхтоўка да навучальнага году ідзе марудна. На шэрагу вучасткаў падрыхтоўчай работы пануе опортуністычная практыка, самацёк.

Факты б'юць трывогу. Гэтыя трывожныя факты павінны ўзварушыць пролетарскую грамадзкасьць і ў першую чаргу комсамол, як шэфа усеагульнага навучаньня.

Рабселькоры, „камандзіры грамадзкай пролетарскай думкі“, павінны па-баявому выйсьці на штурм падрыхтоўкі да навучальнага году. Рабселькораўская армія павінна быць на пера[д]авых позыцыях двухдэкадніка трывогі, павінна быць на аванпостах падрыхтоўчай работы да навучальнага году.

Ва ўсёй гэтай барацьбе выключнае месца павінна заняць організатарская роля кожнага рабселькора-ўдарн[і]ка.

Толькі пры гэтых умовах двухдэкаднік трывогі дасьць патрэбныя вынікі. толькі пры гэтых умовах будзе забясьпечана бальшавіцк[а]я сустрэча навучальнага.

Белдзяржвыдавецтва

Чарапахай клыпае...

Справа з забесьпячэньнем школ падручнікамі абстаіць надзвычайна дрэнна. У гэтым годзе павінна было быць выпушчана падручнікаў 72 назваў. На сёнешні дзень вышла толькі 20. У друку знаходзіцца 27, а 11 нават ня зданы аўтарамі.

Хутка павінен пачацца навучальны год, а аўтары, як Пігулеўскі, Пруднік, Лойка і Бэндэ, якія затрымліваюць у сабе падручнікі, зрываюць гэтым самым сваячасовы пачатак заняткаў.

Не хапае паперы—падручнікі Пігулеўскага, для ШКМ, Разоўскага, Вальковіча і Карачуна—па разьліках „плянавікоў“ Белкоопсаюзу павінны друкавацца ў 25 тыс. экзэмпляраў. І калі БДВ надрукавала ў такой колькасьці, „плянавікі“ апомніліся—зрэзалі да 10 тысяч. г. зн. што **15 тысяч тыражу з кожнай назвы ідзе ў макулатуру.** І гэта ў той час, калі не хапае паперы. Як інакш назваць гэта, калі ня шкодніцтвам?

У раёнах, яшчэ зусім мала падручнікаў, сшыткаў і інш., а **склады БДВ завалены імі.**

Яшчэ невядома колькі і які раён павінен мець падручнікаў і сшыткаў. Некаторыя РВК і райспажкооперацыі яшчэ не заключылі паміж сабой дагавароў аб патрэбнай ім колькасьці падручнікаў і сшыткаў.

Пры такой бясплянавасьці, пры такіх марудных тэмпах, пры такіх яўна опортуністычных адносінах некаторых райвыканкомаў і райспажыўкооперацый, пры шкодніцкай рабоце некаторых „плянавікоў“ Белкоопсаюзу мы не пачнем сваячасова і пасьпахова навучальны год.

Неабходна тэрмінова, каму сьлед, заняцца гэтым пытаньнем і наладзіць ударную і бесьперабойную працу БДВ і Белкоопсаюзу па забесьпячэньню падручнікамі, сшыткамі і інш. усе школы.

Наркомасьветы

ФАКТЫ ВЫНОСЯЦЬ СУВОРЫ ПРЫГАВОР

Апарат Наркомасьветы БССР у асноўным пераключыўся на рэйкі падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году. Наркомасьветы сваячасова даў заяўкі у належныя організацыі на вопратку, абутак і інш. рэчы

Але установы якім дадзен заказ, да гэтага часу не ўзялі ударных тэмпаў у сваёй працы у прыватнасьці Скураб'яднаньне, Белпрамшвэй і інш. Яны сваімі опортуністымі тэмпамі зрываюць сваячасовае забесьпячэньне школ абуткам і вопраткай. Гэтыя аб'яднаньні ня улічылі памылак мінулага году, калі па іх віне быў сарваны выпуск дзіцячай вопраткі і абутку за другі квартал.

Да гэтага часу яны яшчэ не прыступілі да выпрацоўкі заказаў. На сёньнешні дзень маюцца толькі 30 проц. патрэбнай колькасьці вопраткі і абутку. Гэтыя 30 проц. складаюцца з заказаў на другі квартал мінулага году. А да выпрацоўкі цяперашняга заказу яшчэ нават ня прыступалі.

Асабліва дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай для школ кіпяцільнікаў тазаў, катлоў і інш. Для Наркомасьветы патрэбна 5923 кіпяцільнікі. 5923 тазы, 5924 катлы для варкі і 111 чайнікаў. На сёньнешны дзень ніводнай рэчы няма. А заказы, якія зроблены Белкоопсаюзам ня выконваюцца.

Абсталяваньне

Ня лепш абстаіць справа з абсталяваньнем школ. Пастановай Саўнаркому Наркомасьветы адпушчана 4200 мэтраў лесаматар'ялу, але Дзяржплян і Саюзлес займаюцца бюрократычнай валакітай і тармозяць выдачу вызначанай колькасьці лесаматар'ялаў. Толькі ў апошні час гэты матар'ял далі ў распараджэньне Наркомасьветы.

Тармозіць сваячасовы выраб абсталяваньня для школ Белпрамсаюз. Па квартальнаму заданьню Белпрамсаюзу патрэбна выпрацаваць абсталяваньне на 259 тыс, рублёў. А ён чамусьці знайшоў патрэбным ўзяцца за выпрацоўку абсталяваньня толькі на 125 тысяч руб., мотывуючы гэтую устаноўку тым, што ў іх ёсьць шмат іншых заказаў, у той час, калі не нагружаны працай Менскі, Аршанскі і Лоеўскі райпрамсаюзы.



—Мо' там, у нябёснай высі, лунаюць падручнікі БДВ?

Ліквідацыя няпісьменнасьці

Па ліквідацыі няпісьменнасьці ў гэтым годзе прадугледжана плянам Наркомасьветы ахапіць 300 тысяч чалавек Школамі малапісьменных мяркуецца ахапіць у першым квартале 160 тысяч чалавек. У другім квартале 480 тысяч чалавек. Апроч гэтага мяркуецца разгарнуць сетку вячэрніх асьветных установ.

Але Наркомасьветы нічога не зрабіў для таго каб практычна ажыцьцявіць ліквідацыю няпісьменнасьці сярод працоўных. Да гэтага часу яшчэ няма ня толькі сталых, але і прыблізных вестак аб колькасьці няпісьменных і ходу ліквідацыі сярод іх няпісьменасьць У Наркомасьвеце ня ведаюць колькі выпушчана у мінулым годзе ліквідаваўшых няпісьменнасьць.

Політэхнізацыя

Наркомасьветы зусім недастаткова зьвяртае ўвагі політэхнізацыі. Наркомасьветы яшчэ да гэтата часу ня дадзена заяўкі на патрэбныя прылады для політэхнізацыі школ.

Будаўніцтва

Зусім дрэнна абстаіць справа з будаўніцтвам новых навучальных установ і інтэрнатаў. Ў гэтым годзе мяркуецца прыняць у тэхнікумы 1040 чал,, забясьпечаны інтэрнатам ўсяго 400 чал.

Будаўніцтва школ і інтэрнатаў спынена з прычыны недахопу матар'ялу

Саўнарком БССР зараз заняўся пытаньнем стану будаўніцтва школ і інтэрнатаў. Неабходна гэтую справу форсаваць, час не чакае, навучальны год з кожным днём набліжаецца.

Белдзяржснаб

„Іван ківае на Пятра, а Пётр ківае на Івана“...

Адным з адказьнейшых вучасткаў у падрыхтоўцы да новага навучальнага году зьўляецца забясьпечаньне школ і навучальных установ вопраткай, абуткам, гарачым сьнеданьнем і інш. Наркомснабу, якому належыць гэтая важнейшая галіна забесьпячэньня, да гэтага часу амаль нічога не зрабіўпа падрыхтоўцы да навучальнага году.

Згодна прадугледжанага пляну Наркомснабу вызначана на трэці квартал на 44000 чалавек гарачых сьнеданьняў і на 42000 чал. гарбаты. На гэты лік вучняў вызначана ў адпаведнай колькасьці і інш. продуктаў.

Калі мы запыталіся ў працаўнікоў Белдзяржснабу--ці задаволіць гэтая колькасьць вучняў, нам адказалі:

— Мы нават не памятаем колькі у мінулым квартале было вызначана. Але думаем, што хопіць.

Такія разважаньні працаўнікоў Наркомснабу сьведчаць аб пануючай там бясплянавасьці, аб непадрыхтаванасьці да навучальнага году.

Яшчэ горш абстаіць справа з забесьпячэньнем школ вопраткай і абуткам. Проэкт аб забесьпячэньні вучняў абуткам і вопраткай знаходзіцца толькі у стадыі распрацоўкі і ў Белснабе яшчэ нічога невядома. Нам сказалі, калі жадаем даведацца аб гэтым, дык мы павінны прыйсьці праз некалькі дзён.

Наркомасьветы прыслаў ў Белдзяржснаб гадавую заяўку на абутак, вопратку і бялізну. Гэтую заяўку ня зьняўшы копіі, адаслалі ў Цэнтрасаюз і Саюзнаму Наркомснабу, а самі засталіся ні з чым, няма вестак, ня ведаюць колькі трэба загатовіць. Аб разьмеркаваньні вопраткі паміж Белдзяржснабам і Белкоопсаюзам ідуць спрэчкі. Белкоопсаюз гаворыць, што разьмяркоўваць павінен Белснаб. а Белдзяржснаб гаворыць. што гэта павінен рабіць Белкоопсаюз.

У рэйдзе па праверцы падрыхтаванасьці да навучальнага году удзельнічалі юнкоры - ударнікі „ЧЗ“ т. т. Канончык, Крутаўцоў, Кавалевіч. Кузьмянко Дзяменцьцяў, Зысман, Дзяменцьцяў С., Розэнгауз, Крэсік і Шварц.



Дамо чырвонай пісьменнае і палітычна-сьвядомае папаўненьне

Рабселькораўская армія, выходзь у бой за пісьменны прызыў!

ЗЬЕЗД ПАВІНЕН СКАЗАЦЬ СВАЁ СЛОВА

Імпэрыялістыя рыхтуюцца ўзброеннай інтэрвэнцыяй зьнішчыць Савецкі Саюз. Увесь пролетарыят і ў першую чаргу Чырвоная армія павінны будуць даць адпор імпэрыялістым. Для гэтага неабходна, каб наша армія была клясава-сьвядомая, пісьменная і моцная, яна павінна аўладаць высокай вайсковай тэхнікай.

Чырвоная армія кожны год траціць шмат часу на тое, каб навучыць пісьменнасьці прышоўшы маладняк, бо шмат хто з прызыўнікоў—няпісьменныя. У Саюзе Чырвоная армія ў сярэднім траціць каля 2 мільёнаў гадзін на навучаньне няпісьменнага байца.

Чырвоная армія павінна мець клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне,—каб 2 мільёны гадзін можна было скарыстаць для лепшага навучаньня байца вайсковай тэхніцы.

Гэтую задачу можна выканаць толькі пры актыўным удзеле ўсёй пролетарскай грамадзкасьці і ў першую чаргу рабселькораў. Аднак, да сёнешняга дню,—трэба прызнацца,—ні цэнтральны, ні раённы, ні фабрычна-заводзкі друк не ўключыліся, як належыць у барацьбу за пісьменны прызыў. Рабселькоры таксама недастаткова ўвагі аддалі гэтаму пытаньню.

Другі ўсебеларускі гістарычны зьезд рабселькораў павінен быць пунктам адпраўленьня рабселькораў-ударнікаў на яшчэ больш актыўны ўдзел у падрыхтоўцы клясава-сьвядомага і пісьменнага папаўненьня РСЧА.

Трэба, каб рабселькоры, прыехаўшы на месца, узяліся па-бальшавіцку за выкрыцьцё лежабокаў у гэтай справе і практычна дапамаглі мясцовым організацыям у іх барацьбе за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне.

Рабселькорам трэба дабіцца, каб у кожнай раённай, фабрычна-заводзкай газэце быў аддзел аб падрыхтоўцы да прызыву, кожная насьценгазэта павінна сачыць за станам работы сярод дапрызыўнікаў у яе цэху, колгасе, саўгасе і г. д. Шматтыражкі, насьценгазэты, рабселькоры-ўдарнікі павінны ўзяць на сябе абавязак па прыкладу комсамольца—настаўніка Мельнічэнка навучыць грамаце ў сваёй мясцовасьці няпісьменнага дапрызыўніка.

Усебеларускі рабселькораўскі зьезд павінен сказаць свае слова аб удзеле рабселькораў у ажыцьцяўленьні гэтай вялікай політычнай важнасьці задачы.

Рапартуе Бабруйскі галаўны

Райкомам комсамолу Бабруйску мобілізавана 20 комсамольцаў-актывістых гораду, якія накіраваны ў сельсаветы для правядзеньня конфэрэнцый прызыўнікоў 1909 году нараджэньня і разгортваньня паходу за клясава-пісьменны прызыў.

Ужо ў некаторых сельсаветах праведзены конфэрэнцыі прызыўнікоў, праведзен вучот няпісьменных і малапісьменных, для якіх пры сельсаветах організаваны лікпункты.

Для ліквідацыі няпісьменнасьці прызыўнікоў мобілізаваны лепшыя сілы настаўніцтва.

У Паўлавіцкім сельсавеце пры правядзеньні вучоту пісьменнасьці прызыўнікоў выяўлена 11 чал. малапісьменных і тры няпісьменных, для якіх спэцыяльна організавалі лікпункты.

Па лініі разгортваньня паходу па горадзе райкомам комсамолу праведзена нарада гарадзкіх ячэек і колектываў ЛКСМБ.

Хазанаў.

Ня маеце права бязьдзейнічаць

Менскі раён пастановай ЦК ЛКСМБ вылучан галоўным атрадам у правядзеньні ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Здаецца, што Менгарком ЛКСМБ павінен быў адразу ўзяцца за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК ЛКСМБ. Але на самой-жа справе Менгаркамол ніякай работы, акрамя напісаньня аднэй пастановы, не зрабіў.

Менгаркамол дзён дзесяць таму назад вынес пастанову аб мобілізацыі 100 комсамольцаў з пэдфаку і Белпэдтэхнікуму для ліквідацыі сярод прызыўнікоў няпісьменнасьці. Але да гэтага часу, хаця студэнты ўжо паехалі на летнія вакацыі, Менгарком не паклапаціўся сваю пастанову выканаць.

Загадчык вайсковага сэктару ГК Вярбіцкі і Гурвіч, атрымалі вымову за бязьдзейнасьць у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці. Але бязьдзейнічаць усё прыцягваюць.

Комсамол ня мае права бязьдзейнічаць.

В. К.

НА ВЫКЛІК „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“ ДА „ЮНГЭ-ГАРДЭ“

АДКАЗВАЕ КОМСАМОЛ ЛЕЙПЦЫГУ

КОМСАМОЛЬЦЫ МЕНСКУ, ПРАВЕРЦЕ ВЫКАНАНЬНЕ АБАВЯЗКАУ ПА СОЦДАГАВОРЫ

Да ўсіх рабселькораў, да ўсіх дэлегатаў другога усебеларускага зьезду рабселькораў

10 ліпеня пачынае сваю работу другі ўсебеларускі зьезд рабселькораў, які склікаецца ЦК КП(б)Б і рэдакцыяй газэты „Зьвязда“.

Партыя прыдавала і прыдае вялізарнае політычнае значэньне далейшаму разьвіцьцю, далейшым посьпехам масавага рабселькораўскага руху і масаваму росту нізавога фабрычна заводзкага і колгаснага друку.

Рабселькоры зьяўляюцца „камандзірамі пролетарскай грамадзкай думкі, якія імкнуцца накіраваць невычарпальныя сілы гэтага вялізарнейшага фактару на дапамогу партыі і савецкай уладзе ў цяжкай справе соцыялістычнага будаўніцтва“ (Сталін).

Гістарычнае значаньне надыходзячага ўсебеларускага зьезду рабселькораў у тым, што зьезд склікаецца ў трэці рашаючы год пяцігодкі, у дні перабудовы рабселькораўскага руху, калі „рабселькоры становяцца пад кіраўніцтвам партыі організатарамі мас для справы соцыялістычнага будаўніцтва, выкананьня вытворчых плянаў і разгорнутага наступленьня на клясавых ворагаў“ (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 г.)

Умовай далейшага ўзьняцьця рабселькораўскага руху і яго посьпехаў зьяўляецца перабудова работы рабселькораў, забесьпячэньне сыстэматычнага і чулага партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

Факты недаацэнкі нізавога друку, факты недаацэнкі неабходнасьці забясьпечыць партыйнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам—зьяўляюцца праявай правага опортунізму і павінны бязьлітасна выкрывацца.

Перадаючы ў асобе дэлегатаў усебеларускага зьезду рабселькораў бальшавіцкае прывітаньне ўсёй шматтысячнай арміі рабселькораў Савецкай Беларусі, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б зварачвае ўвагу ўсёй КП(б) на тое, што ЦК УсеКП(б), у сваёй пастанове аб перабудове рабселькораўскага руху, падкрэсьлівае „невыстарчальнае кіраўніцтва рабкораўскім і селькораўскім рухам, асабліва ў нацвобласьцях і раёнах з боку партыйных організацый і рэдакцый газэт“.

Праведзены нядаўна ЦК КП(б)Б ва ўсіх раёнах БССР масавы агляд самаправерка становішча нізавога друку, рабселькораўскага руху і партыйнага кіраўніцтва ім, выявіў рад буйнейшых прарываў ў гэтай аднэй з важнейшых галін работы.

Неабходна на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і пастаноў ЦК КП(б)Б аб друку дабіцца поўнага замацаваньня дасягнутага ў апошнія месяцы ў БССР пералому у пытаньні забесьпячэньня сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б падкрэсьлівае, што ўся партыйная організацыя ў цэлым, кожная парт ячэйка ў паасобку нясе непасрэдную адказнасьць за становішча нізавога друку і работу з рабселькорамі.

Адсутнасьць у тым ці іншым раёне колькаснага і якаснага росту нізавых газэт, адсутнасьць сыстэматычнай і паглыбленай штодзённай політычна-выхаваўчай работы з рабселькорамі—павінна рызглядацца як сыгнал аб нездавальняючым становішчы ў даным раёне разгортваньня пролетарскай самакрытыкі і барацьбы за яе дзейнасьць.

Неабходна яшчэ больш павысіць бальшавіцкую баяздольнасьць друку і рабселькораўскага руху, як зброю ў руках партыі ў барацьбе на два франты, за ленінскую нацыянальную політыку, за далейшае павышэньне абароназдольнасьці краіны, у барацьбе за трэці рашаючы год пяцігодкі, за генэральную лінію партыі.

Пастановы пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, якія нядаўна скончылі сваю работу, а таксама прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, ставяць перад усёй рабочай клясай, перад усімі працоўнымі рад важнейшых задач у справе барацьбы за далейшыя посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва.

Фабрычна-заводзкі і колгаснасаўгасны друк, увесь рабселькораўскі рух у цэлым павінны быць перадавымі барацьбітамі ў барацьбе за выкананьне гэтых задач. Пад кіраўніцтвам партыі, пасьлядоўна і настойліва вядучы барацьбу за далейшае разгортваньне і дзейнасьць пролетарскай самакрытыкі, цэмантуючы ўсю сваю работу соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, цэмантуючы асабістым прыкладам, рабселькоры і нізавы друк павінны разам з тым сыстэматычна і глыбока даваць на старонках друку разгорнуты паказ дасягненьняў соцыялістычнага будаўніцтва, паказ лепшых узораў.

Кожны рабселькор павінен быць ударнікам, кожны ударнік—рабселькорам.

Няхай жыве друк—„самая моцная, самая вострая зброя партыі“.

Няхай жыве правадыр і організатар соцыялістычнага будаўніцтва—комуністычная партыя.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б

Ударнікам пролетарскага друку--баявое, комсамольскае

ЦК ЛКСМБ ад імя 130000 арміі ленінскага комсамолу Беларусі шле ІІ-му ўсебеларускаму зьезду рабселькораў баявое комсамольскае прывітаньне.

Зьезд сабраўся ў пэрыод нячуваных тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, пры нябывалым узросьце энтузіязму працоўных мас у барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне генэральнай лініі партыі, у якой агромністую ролю адыгрывае друк, як самая моцная зброя, колектыўны організатар у руках пролетарыяту.

Ленінскі комсамол—ударная брыгада соцыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, непрымірыма змагаецца за бальшавіцкія тэмпы работы на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, і на аснове разгортваньня самакрытыкі выкрывае недахопы, якія перашкаджаюць пераможнаму соцыялістычнаму будаўніцтву.

ЦК спадзяецца, што зьезд з посьпехам прапрацуе ўсе пытаньні, стаячыя на абвестцы дня і яшчэ больш мобілізуе рабселькораў і ўсіх працоўных на завяршэньне пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Няхай жыве комуністычная партыя—кіраўнік і організатар усяго пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве шматтысячная армія рабселькораў—актыўных змагароў за генэральную лінію партыі.

У нумары 105 „Чырвонай Зьмены“ за 10 мая мы друкавалі ліст да газэты комсамолу Нямеччыны „Юнгэ Гардэ“ з прапановай у адзнаку 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ і ў парадку падрыхтоўкі да 17-га МЮД'у заключыць рэволюцыйнае спаборніцтва двух газэт.

Комсамол Менску ўжо спаборнічае з агітпропгрупай Лейпцыгу. Як агітпропгрупа, так і менскія комсамольцы узялі на сябе шэраг абавязкаў. Зараз у сувязі з выклікам „Чырвонай Зьмены“ уся лейпцыгская раённая організацыя комсамолу ўключаецца ў соцыялістычнае спаборніцтва і бярэ шэраг абавязкаў, якія мы сёньня друкуем.

У адказ на гэтыя абавязкі Менскі Гарком ЛКСМБ у парадку падрыхтоўкі да ХУІ-га МЮД'у павінен вызначыць шэраг конкрэтных мерапрыемстваў, паклаўшы ў аснову праверку выкананьня соцыялістычнага дагавору з агітпропгрупай і рашэньняў комсамольскіх зьездаў аб інтэрнацыянальнай рабоце.

„Чырвоная Зьмена“ бярэ на сябе абавязак узнагародзіць чырвоным сьцягам імя „Чырвонай Зьмены“ комсамольскую ячэйку Лейпцыгскай організацыі, якая лепш выканае ўзятыя на сябе абавязкі па соцыялістычнаму спаборніцтву з комсамольскай організацыяй Менску.

Лейпцыг, 24 чэрвеня 1931 г.

Ленінскаму комуністычнаму саюзу моладзі Беларусі (Менск)

Копіі:
„Юнгэ Гардэ, Бэрлін
„Чырвоная Зьмена“,
Менск.
Саксонскі акругком комсамолу.

Таварышы!

У лісьце газэты „Чырвоная зьмена“ газэ е „Юнгэ Гардэ“ мы чыталі Ваш выклік на соцспаборніцтва комсамольцам Лейпцыгу.

Комсамольцы Лейпцыгу вырашылі Ваш выклік прыняць і лічыць соцспаборніцтва пачатым!

У той час, як мы, маладыя пролетары Нямеччыны і Вызваленага Савецкага Саюзу зьвязваемся праз соцспаборніцтва інтэрнацыянальнай сувязьзю, у Лейпцыгу засядаў нядаўна зьезд здраднікаў рабочае клясы і ініцыятараў інтэрвэнцыі супроць вашай і нашай бацькаўшчыны—СССР—зьезд соцыял-дэмократычнай партыі Нямеччыны, на чале з крывавымі сабакамі Носке, Цэргібель і Зэверынгам. Уноўяны сабраліся выпрацаваць проекты здраадніцтва рабочае клясы, каб дакумэнтаваць сваю аддапасьць капіталістым.

Таварышы! Вы наносіце самыя моцныя ўдары капіталізму свай барацьбой на гаспадарчым фронце—„пяцігодка ў чатыры гады“. Мы падкапваем капіталізм сваёй штодзённай работай. Мы павінны весьці сыстэматычную барацьбу за аўладаньне масамі рабочае моладзі. Ня гледзячы на тэрор і рэпрэсіі мы вырываем глебу з пад ног варожых нам організацый. Мы павінны выканаць задачу, пастаўленую перад намі ЦК партыі—ліквідаваць „соцыялістычную рабочую моладзь“, гэта аддзяленьне партыі соцыял-фашыстых, як масавую організацыю.

Выходзячы з політычнага становішча ў даны час і магчымасьцяй работы комсамольцаў Лейпцыгу, мы лічым патрэбным узяць на сябе наступныя абавязкі, якія павінны быць выкананы да 15 верасьня 1931 г.

1. У галіне работы на фабрыках

Павялічыць колькасьць існуючых фабрычных ячэек з 4 да 12; Выпуск 15 фабрычна-заводзкіх газэт. Організаваць 15 фабрычна-заводзкіх сходаў.

2. У галіне работы рэв. профопозыцыі.

Організаваць у РПО 100 беспрацоўных маладых пролетараў. Організаваць 2 профсаюзныя фракцыі. Організаваць 8 груп моладзі ў РПО.

3. У галіне работы сярод соцыял-дэмократычнай рабочай моладзі.

Выдаць 20 лістовак да членаў „СРМ“ Выдаць 3 газэты членаў опозыцыі „СРМ“. Організаваць 10 дыскусыйных вечароў з сябрамі „СРМ“. Перацягнуць 50 членаў СРМ“ у комсамол.

4. У галіне работы сярод маладых рабочых, членаў фашысцкіх організацый.

Выдаць 3 лістоўкі да членаў фашысцкіх організацый. Організаваць 2 дыскусійных вечары з членамі фаш. организацый. Перацягнуць 10 членаў фашысцкіх організацый, маладых рабочых у комсамол.

5. У галіне распаўсюджваньня „Юнгэ Гардэ“

Павысіць колькасьць прадаваемых экз. з 500 да 800. Павялічыць колькасьць абанэмэнтаў з 150 на 300. Організаваць 10 маладых рабкораў.

6. У галіне піонэрскага руху.

Выданьне трох вучнёўскіх газэт. Павялічыць колькасьць членаў з 800 на 1000.

7. У галіне антыфашысцкіх організацый.

Павялічыць колькасьць членаў з 400 на 600. Заснаваць 3 групы (Берэйтшафтэн“) „Антыфашысцкай маладой гвардыі“.



Юнацкая дэмонстрацыя ў Лейпцыгу

8. У галіне інтэрнацыянальнай сувязі.

Організаваць сыстэматычную, цесную сувязь з 10 заводамі Савецкай Беларусі.

9. Галіне росту комсамолу.

Ператварэньне ўсіх груп у вулічныя ячэйкі. Павялічэньне колькасьці членаў комсамолу Лейпцыгу з 1300 на 1800.

10. У галіне работы сярод батрацкай моладзі.

Правесьці 2 цэнтральных агіт-паездак у вёскі. Правесьці 2 зьлёты ў вёсках.

11. У галіне работы сярод вучняў профшкол.

Організаваць 5 вучнёўскіх сходаў. Выпусьціць 8 школьных газэт.

12. У галіне вучобы сярод членаў комсамолу.

Організаваць 12 курсаў („Воханэндкурсэн“).

Соцспаборніцтва працягваецца ад першага ліпеня да 15 верасьня 1931 г. Як трацейскіх судзьдзяў, мы прапануем з нашага боку:

Саксонскі акругком комсамолу і рэдакцыю газэты „Юнгэ Гардэ“, Бэрлін.

Няхай жыве інтэрнацыянальная солідарнасьць рэволюцыйнага пролетарыяту!

Няхай жыве комуністычны інтэрнацыянал!

Няхай жыве комуністычны інтэрнацыянал моладзі!

Няхай жыве наша барацьба—няхай жыве наша перамога!

З прывітаньнем Рот-Фронт

Лейпцыгскі райком комсамолу Нямеччыны.

Рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“

Дарагія таварышы!

Я вам дасылаю адзін мой артыкул і ліст комсамолу Лейпцыгу.

Гэтымі днямі дашлю вам артыкул тав. Роряпера аб спартакіядзе і таксама аб зьлёце саксонскіх баявых організацый у Мітвайдзе. Аб спартакіядзе, буду вас сыстэматычна інфармаваць.

Ваш ліст для „Юнгэ Гардэ“ я перавёў і адаслаў рэдакцыі гэтай газэты ў канцы мая, разам з лістом лейпцыгскага райкому комсамолу. У гэтым лісьце Лейпцыг пісаў, што прымае ваш выклік і абяцаў зараз-жа па надрукаваньню вашага ліста ў газэце „Юнгэ Гардэ“ абвясьціць аб а авязках, узятых комсамолам Лейпцыгу. У пачатку чэрвеня я асабіста быў у рэдакцыі „Юнгэ Гардэ“ ў Бэрліне і прасіў яшчэ раз аб датэрміновым надрукаваньні вашага ліста. Хаця рэдакцыя і абяцала, але па невядомых мне прычынах не змагла ў працягу трох тыдняў чэрвеня гэты ліст надрукаваць. Яна абяцала ўсё-ж яшчэ ў чэрвені гэта зрабіць. Але... 24 чэрвеня поліцэй-прэзыдэнт Бэрліну забаракіў газэту на 4 тыдні.

У сувязі з гэтым лейпцыгскія таварышы рашылі больш не чакаць і адказаць непасрэдна Менскаму комсамолу праз вас. З ліста комсамольцаў Лейпцыгу вы бачыце, што соцспаборніцтва павінна працягвацца не да МЮД'у, а да 15 верасьня,—інакш застаецца надзвычайна мала часу. Спадзяюся, што вы зараз-жа давядзеце да ведама комсамолу Менску аб адказе комсамольцаў Лейпцыгу, што яны ня прымусяць доўга чакаць адказу. Сыстэма пунктаў, якую таварышы прапануюць выгадна у тых адносінах, што яна дае магчымасьць хутка і лёгка орыентавацца ва ўжо дасягнутых выніках і дазваляе ўстанавіць, хто выканаў і хто ня выканаў узятыя на сябе абавязкі.

Таварышы з вялікім энтузіязмам узяліся ўжо цяпер за выкананьне ўпамянутых у прыкладзевым лісьце абавязкаў. Для таго, каб уцягнуць увесь комсамол, як Лейпцыгу, так і Менску у гэта соцспаборніцтва, трэба было-б устанавіць якую небудзь прэмію. Я-б прапанаваў пераходныя сьцягі—нямецкі для лепшай ударнай групы альбо ячэйкі комсамолу Менску і савецкі—для лепшай ударнай групы комсамолу Лейпцыгу.

Гэтыя сьцягі павінны заставацца ў лепшай групы, але праз вядомы прамежак часу павінен быць праведзены кантроль. Такім чынам, такі сьцяг можа мець вялікае значаньне для актывізацыі організацыі.

Акрамя таго прапаную абгаварыць пытаньне аб пасылцы да МЮД'у дэлегацыі з Лейпцыгу ў Менск. Гэтакая дэлегацыя павінна складацца з трох таварышоў—аднаго ўдарніка лейпцыгскага комсамолу і 2 сымпатызуючых комсамолу беспартыйных, альбо опозыцыйных членаў СРМ. Значэньне гэтакай дэлегацыі вам зразумела.

Спадзяюся, што не затрымаеце адказ, бо часу засталося вельмі мала.

З комуністычным прывітаньнем.

А. Проко

ДАВОЛІ РАЗМОУ

Дайш практычнае стварэньне маладзёжных старонак і куткоў

Рэйд ударнікаў „чырвоназьменаўцаў“ па Менску паказаў, што рад камсамольскіх арганізацый ня сталі на чале юнкораўскага руху

Армія юнкораў, як і ўся армія рабселькораў, прыходзіць да свайго зьезду значна ўзрослай, узмоцненай, перабудаваўшай у асноўным свае шэрагі згодна рашэньню Ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады.

Аднак, кіраўніцтва юнкораўскім рухам як з боку комсамольскіх арганізацый, так і з боку юнацкіх і іншых газэт, не на многа палепшылася. Аб гэтым сьведчыць зьмешчаны ў сёньнешнім нумары матар'ял рэйду чырвоназьменаўскіх брыгад на буйныя прадпрыемствы Менску.

Комсамольскія арганізацыі не дабіліся пералому таксама ў арганізацыі пры кожнай раённай газэце, фабрычна-заводзкай шматтыражцы і цэхавай насьценгазэты, маладзёжных старонак, куткоў. Ніводны РК, ніводны колектыў КСМ не паставіў і гэтага пытаньня практычна, не дабіліся таго, каб у кожнай рэдакцыі раённай газэты, шматтыражкі ўвялі спэцыяльнага рэдактара маладзёжнай старонкі, што зьяўляецца для існаваньня гэтай старонкі галоўнай умовай. Комсамольскія колектывы і РК павінны як мага хутчэй дамагчыся гэтага.

Організацыя маладзёжных старонак у значнай ступені залежыць таксама ад партыйных і профэсыйных організацый. Яны павінны аказаць комсамолу належную дапамогу дзеля ажыцьцяўленьня гэтага.

Замацаваць дасягненьні, зьнішчыць недахопы

Партыйна-комсамольскія колектывы Менскага чыгуначнага вузла сапраўды змагаюцца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб перабудове працы транспорту.

Шматтыражка „Чырвоны чыгуначнік“ шырока асьвятляе на сваіх старонках задачы, якія стаяць перад транспортам, змагаецца за спараную, за ліквідацыю абязьлічкі, за посьпех асеньня-зімовых перавозак.

Колектыў цягі мае пяць насьценгазэт, якія таксама адпавядаюць свайму прызначэньню.

Партыйна-комсамольскія колектывы разгарнулі вялікую работу па падрыхтоўцы да рабселькораўскага зьезду. Шырока прапрацаваны тэзісы па чыгуначнаму і воднаму транспорту. Організаваны некалькі вытворчых рабкораўскіх брыгад, а таксама і юнкораўская брыгада ў колькасьці 36 асоб (пасажырская станцыя).

Але, побач з гэтым у працы комсамольскага колектыву маюцца недахопы: комсамольскі колектыў налічвае 110 комсамольцаў і 80 чал. беспартыйнай моладзі. З гэтага ліку юнкораў ёсьць 10 чалавек, якія ўдзельнічаюць у насьценгазэтах і толькі 3-4 з іх у шматтыражкі.

Бюро колектыву комсамолу ніякай масавай работы сярод юнкораў не праводзіць. Маладзёжныя куткі ў насьценгазэтах і старонках у шматтыражцы ня існуюць. Іх толькі яшчэ мяркуюць зрабіць.

Бюро комсамольскага колектыву павінна стаць на чале разгортваньня юнкораўскага руху на чыгунцы.

Брыгада „Ч. З“ Крэсін, Мажэвіч.

Маладзёжныя куткі і старонка—будуць

На фабрыцы „Комунарка“ (Менск) ёсьць 3 цэхавых насьценгазэты і адна шматтыражка „Комунарка“. Маладзёжных куткоў як пры шматтыражцы, так і пры цэхавых насьценгазэтах да гэтага часу няма. Пытаньню жыцьця моладзі газэты зусім мала надаюць увагі. Напрыклад, у апошнім нумары фабрычнай шматтыражкі амаль зусім няма матар'ялу аб жыцьці моладзі.

Працу юнкораў, ударных юнкораўскіх брыгад, змаганьне іх за выкананьне промфінпляну і г. д. шматтыражка не асьвятляе.

Зараз на фабрыцы налічваецца каля 100 чалавек юнкораў і рабселькораў, але колькі маецца з іх юнкораў, ні сэкратар колектыву, ні рэдактар шматтыражкі ня ведаюць. Ніякай масавай работы з юнкорамі фабрыкі не праводзіцца, толькі ў зьвязку з надыходзячым зьездам, праведзены аб'яднаны зьлёт юнкораў і рабкораў, дзе была прапрацавана пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькорруху.

Комсамольская організацыя фабрыкі і рэдколегія шматтыражкі зараз узялі на сябе абавязак утварыць куткі моладзі ў насьценгазэтах, а таксама і старонку пры шматтыражцы, к адчыненьню рабселькораўскага зьезду гэты абавязак будзе выкананы.

За апошнія дні організаваны тры юнкораўскія ўдарныя брыгады. Наладжаны рэйд юнкораў фабрыкі па пытаньню штурму, на ліквідацыю прарываў промфінпляну, (які ня выкананы на 30 проц.).

Брыгада „Ч. З.“ Канончык і Крутаўцоў.

Разьбіць опортуністычную недаацэнку

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і аб месячніку друку шырока абгаворана сярод рабочых штотачнай фабрыкі імя Крупскай (Менск), што выклікала магутны прыліў ударнікаў у шэрагі раб-юнкораў. За час прапрацоўкі пастановы, рабкораўская армія шчотачнай фабрыкі павялічылася на 15 чалавек. Зараз на фабрыцы налічваецца 48 рабкораў, з якіх 20 юнкоры.

Але, партыйна-комсамольскія і профэсыйныя організацыі не змаглі яшчэ дагэтуль забясьпечыць сталага штодзённага кіраўніцтва рабкорамі і юнкорамі. Шматтыражка „Сыгнал шчотачніка“ выходзіць з вялікімі перабоямі. Цэхавыя насьценгазэты да гэтага часу яшчэ не займаліся пытаньнем падрыхтоўкі да зьезду, і наогул, яны выходзяць толькі да сьвят. Напрыклад, насьценгазэта наборачна-аддзелачнага цэху „Малады ўдарнік“ вышла да першага мая і матар'ял з таго часу не мяняўся.

Ня гледзячы на ўзрастаючую актыўнасьць юнкораў фабрыкі комсамольская організацыя не стала на чале гэтай актыўнасьці, не мобілізавала яе на выкананьне задач 3-га рашаючага. Бюро комсамольскага колектыву опортуністычна недаацэньвае організацыю маладзёжных куткоў пры насьценгазэтах і старонкі пры шматтыражцы. Бюро партыйнага колектыву таксама нічога не зрабіла па пытаньню кіраўніцтва і разгортваньня рабюнкорруху на фабрыцы.

Ударнікі „Ч. З.“ Кузьменка З., Абрамава Г. Ярхо Г.

„Яна павінна дзесьці быць—пашукайце!“

На заводзе „Д. А.“ (Менск) налічваецца каля 70-ці рабкораў і юнкораў. Але комсамольскі колектыў не зьвяртае на іх увагі—ня кіруе імі.

Да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў комсамол заводу не падрыхтаваўся. Комсамольцы не распрацоўвалі тэзісаў да зьезду. Сэкратар комсамольскага колектыву абмежаваўся тым, што па некаторых цэхох зрабілі лятучыя мітынгі.

На зьмяшчаемыя допісы ў насьценгазэце, так і шматтыражцы, адміністрацыя і грамадзкія організацыі заводу не рэагуюць, дзякуючы чаму ў хлапцоў прападае жаданьне пісаць.

Комсамольскі колектыў, асабліва культмасавы сэктар, ня цікавіцца працай насьценгазэты. Ніводная газэта ня мае маладзёжнага кутка. Адносіны да насьценгазэт яскрава гавораць аб тым, што ніхто імі ня цікавіцца, напрыклад, у мэханічным цэху рабочыя ўжо забыліся калі ў іх была насьценгазэта, а калі запыталіся культмасавага працаўніка „тав. Экальш, дзе ваша насьценгазэта“, дык ён адказаў: „яна павінна дзесьці быць... пашукайце!“ Каб скрыць сваю бязьдзейнасьць, ён насьля дадае: „мы яшчэ не пасьпелі разгарнуць сваю працу, бо ў нас нядаўна былі перавыбары“

Пры шматтыражцы заводу старонкі моладзі няма.

Комсамольскі колектыў зараз-жа павінен перабудаваць сваю працу. Наладзіць сталае кіраўніцтва юнкоррухам, наладзіць выпуск маладзёжнай старонкі пры шматтыражцы і маладзёжных куткоў пры насьценгазэтах, зрабіўшы іх люстрам арганізатарам жыцьця і працы рабочай моладзі.

Ударная брыгада „ЧЗ“ Сімянцоў і Родшыльд.

НА ШТУРМ УБОРКІ

Ударным правядзеньнем уборачнай мацаваць дасягненьні 2-й бальшавіцкай

У выніку ўдарнай работы пад кіраўніцтвам партыі, рабочае клясы, шырокіх мас колгасьнікаў, беднякоў і серадняков-аднаасобнікаў за датэрміновае выкананьне плянаў другой бальшавіцкай вясны па БССР дасягнуты буйнейшыя перамогі ў галіне социялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Заданьне партыі, за час вясновай сяўбы уцягнуць у колектывы 35 проц. бедняцка-серадняцкіх гаспадарак, перавыканана. На першае ліпеня—39,7 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ахоплена колгасамі. Шэраг раёнаў (Койданаўскі, Лепельскі і інш.) падыйшлі да завяршэньня ў асноўным суцэльнай колектывізацыі.

Пасеўная плошча ў параўнаньні з леташнім перакрыта на 7 проц.

План сяўбы лёну па БССР значна перавыкананы. Удзельная вага ўзрасла. У найкарацейшым будучым лён зьявіцца вядучай галінай сельскай гаспадаркі БССР.

Бальшавіцкі друк, цэнтральныя і раённыя газэты, шматтыражкі, насьценгазэты, МТС, колгасаў і саўгасаў з іх шматтысячнай арміяй рабселькораў і юнкораў у барацьбе за выкананьне пастаўленых партыяй задач адыгралі рашаючую ролю.

Але перамогу вясновай сяўбы трэба замацаваць яшчэ больш пасьпяховым правядзеньнем уборачнай кампаніі.


Задачы ўборачнай кампаніі па сваіх памерах вялічэзныя. Трэба пасеянае захаваць ад шкоднікаў і своечасова прыбраць. Разам з гэтым у пэрыод правядзеньня ўборачнай кампаніі, збожжавых і тэхнічных культур нам трэба праводзіць шэраг іншых адказнейшых работ, уздым зябі, падрыхтоўка да асеньняй сяўбы і інш. Гэты пераплёт адказнейшых работ у час уборачнай кампаніі патрабуе ўдарных тэмпаў работы ўсёй працоўнай грамадзкасьці і асабліва нізавога друку з яго шматтысячнай арміяй рабселькораў, як організатараў і памочнікаў партыі.

Мы маем у наяўнасьці ўсе магчымасьці для таго, каб уборачную кампанію правесьці ў скарочаныя тэрміны. 44 мільёны чалавека-дзён якія патрэбны для колгасаў, пакрываюцца за кошт маючыхся ў колгасах рабочых рук, трэба толькі організаваць правільна іх работу, узьняць вытворчасьць працы.

Горшы стан з рабочай сілай мы маем па саўгасах. Саўгасы ня маюць патрэбнай колькасьці рабочых рук. Аднак, пры правільнай організацыі працы ў колгасах, апошнія змогуць і павінны аказаць дапамогу рабочай сілай саўгасам і гэтым самым забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне ўборачнай па саўгасах.

Рабселькоры, ударнікі павінны ў барацьбе за бальшавіцкае правядзеньне ўборачнай кампаніі сконцэнтраваць сваю ўвагу на правільную організацыю працы ў колгасах, перавод усіх колгасаў на зьдзельшчыну з улікам працадзён на колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка. Трэба па-ўдарнаму працягваць пачатую работу ў гэтай галіне да пяцідзёньнікаў, рашуча біць па ўсялякіх фактах скажэньня бальшавіцкага прынцыпу зьдзельшчыны, па падзёншчыне і ўраўнілаўцы, як асноўных перашкод у барацьбе за тэмпы. Абагульваючы і распаўсюджваючы лепшыя ўзоры вопыту зьдзельшчыны і організацыі працы, нізавы друк і рабселькоры праз разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, складаньні сустрэчных плянаў уборкі, павінны змагацца за датэрміновае сканчэньне плянаў уборачнай.

Адна з найвялікшых і адказнейшых задач уборачнай кампаніі—падвесьці кармавую базу пад социялістычную жывёлагадоўлю, своечасова і поўнасьцю прыбраць сенажаці, нарыхтаваць ня менш мільёну тон сілосу,—вось конкрэтная програма дзеяньняў у барацьбе за кармовую базу.



Змагаючыся за бальшавіцкую падрыхтоўку да ўборкі збожжавых і тэхнічных культур, трэба зараз шырока разгарнуць работу па падрыхтоўцы да абмалоту і хлебазагатоўчай кампаніі, дабіцца каб прыбранае збожжа зараз-жа паступала на малатарню і ад малатарні таварная частка хлебазагатоўчым організацыям.

Рабселькор-ударнік павінен у колгасе, саўгасе, МТС быць асабістым прыкладам ударнай работы, запальваць энэргію і энтузіязм астатніх колгасьнікаў у барацьбе за тэмпы і за датэрміновае выкананьне плянаў.

Нізавы друк і рабселькоры павінны зьявіцца організатарамі шырокай масавай работы па ўцягненьню ўсіх колгасьнікаў у соцспаборніцтва, у ўдарныя брыгады.

Толькі ўдарнай работай, шырокай мобілізацыяй усёй працоўнай грамадзкасьці на выкананьне пастаўленых партыяй задач перад уборачнай кампаніяй мы зможам замацаваць посьпехі другой бальшавіцкай і яшчэ з больш шпаркімі тэмпамі ісьці наперад, каб дырэктыва партыі—кончыць у асноўным суцэльную колектывізацыю ў 1932 г.—была выканана.

Б.

ВЫХОДЗЬЦЕ НА ДЭМОНСТРАЦЫЮ-КАРНАВАЛ!

Прапануецца ўсім сэкратарам к-ваў і ячэек зараз-жа ўзмацніць тэмпы працы да падрыхтоўкі агульна-гарадзкой дэмонстрацыі - карнавалу, які адбудзецца 10 ліпеня 1931 г. а 5 гадзіне ўвечары.

1. Кожная рабочая організацыя комсамольскага колектыву і ячэйцы, вытворчых, вузаўскіх і савецкіх устаноў, дэмонструюць і популярызуюць працу свайго комсамольскага друку, рост нізавога друку, шматтыражкі.

2. Рабселькорам, юнкорам-ударнікам падрыхтаваць і мастацка афарміць працу сваіх брыгад, агрэгатаў, комун.

3. Падрыхтаваць фізкультурныя калёны вытворчых, вузаўскіх і савецкіх гурткоў фізкультуры, якія павінны ўдзельнічаць калёнамі ў карнавале.

4. Узмацніць тэмпы падрыхтоўкі карнавалу да ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Кожнаму прадпрыемству, установам і вузаўскім ячэйкам забясьпечыць дэмонстрацыю-карнавал оркестрамі музыкі.

5. Збор дэмонстрацыі праводзіцца на прадпрыемствах ці ўстановах роўна а 5 гадзіне. Шлях сьледваньня дэмонстрацыі па вул. Карла Маркса да клюбу Комасьветы, дзе адбудзецца кароткі мітынг з выступленьнем лепшых рабселькораў („Комунар“, „Варашылаў“ і хэмкамбінат). Колектывам і ячэйкам забясьпечыць 100 проц. яўку на дэмонстрацыю ўсіх комсамольцаў і юнкораў-ўдарнікаў, а таксама і беспартыйнай моладзі. За падрыхтоўку і парадак дэмонстрацыі адказваюць сэкратары колектываў і ячэек.

Культпроп Менгеркаму ЛКСМБ.

Абвестка

11-га ліпеня 1931 г. у дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, Менгарком ЛКСМБ разам з райваенкаматам наладжвае масавы выхад у лягеры „Чырвонае Урочышча“.

ГК ЛКСМБ абавязвае ўсе комсамольскія ячэйкі і колектывы забясьпечыць яўку дапрызыўнікаў і ўсю моладзь, якая будзе мець выходны дзень. Збор у двары Райваенкамату, а 8-й гадзіне раніцы.

Менгарком ЛКСМБ.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599